ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 29 (1179) ● 3 лістапада 1977 г. Цана 2 кап.




В. БЕРШАДСКИЙ

## Всем! Всем! Всем!

Залп «Авроры» грохочет
не день, не два —
салютует
шестидесятилетию.
Слышишь,
Ленина
в Смольном
звучат слова —
и от моря до моря
несется эхо.
Ключ морзянки
на крейсере вновь морзит:
— Всем! — Всем! — Всем! —
повторяет радиограмма.
Грозный ветер Истории
так сквозит,
что врывается утром
в окно Вьетнама.
— Всем! — Всем! — Всем! —
бронебашен октябрьский гул...
Откликается мир
с телетайпной ленты.
Лондон. Санто-Доминго.
Каир. Сеул.
Сотрясаются страны
и континенты.
Закаляется
в подвигах века
сталь,
революция пламенем пишет
повесть,
Широко
открывая за далью даль,
следопыты Земли
продолжают поиск.
Серебрятся берёзы родной
Руси,
пламенеет над крейсером
флаг рассвета.
Продолжает вращаться
вокруг оси
устремлённая в будущее
планета.



# ВСТРЕЧАЯ СЛАВНЫЙ ПРАЗДНИК

**Среди трудовых коллективов республики — победителей Всесоюзного соревнования по итогам первого года X пятилетки был, как известно, и коллектив Белорусского ордена Трудового Красного Знамени Государственного университета имени В. И. Ленина. Недавно президиум ЦК профсоюза работников просвещения, высшей школы и научных учреждений изучил, обобщил опыт работы нашего коллектива по развитию социалистического соревнования, улучшению подготовки и идейно-политического воспитания специалистов, расширению научных исследований и повышению эффективности труда научно-педагогических работников, за успешное выполнение X пятилетки и достойную встречу 60-летия Великой Октябрьской социалистической революции, одобрил этот опыт и рекомендовал его республиканским комитетам профсоюза и вузам страны. Сегодня мы публикуем статью ректора университета, члена-корреспондента АН БССР В. М. СИКОРСКОГО, в которой рассказывается, как коллектив старейшего вуза республики встречает славный юбилей Октября.**

Награждение Белгосуниверситета имени В. И. Ленина переходящим Красным знаменем ЦК КПСС, Совета Министров СССР, ВЦСПС и ЦК ВЛКСМ по итогам 1976 года — первого года десятой пятилетки весь наш коллектив воспринял не только как весьма радостную, окрыляющую весть, но и как событие, весьма ко многому нас обязывающее. Поэтому, вступая во второй год пятилетки — год юбилея Великого Октября, ректорат, партийный комитет направили свои усилия на дальнейшее развертывание социалистического соревнования с тем, чтобы мобилизовать весь коллектив профессоров, преподавателей, сотрудников, аспирантов и студентов на совершенствование качества подготовки и воспитания молодых специалистов, развитие и повышение эффективности научных исследований. Активными нашими помощниками в решении этих задач являются партийные, профсоюзные и комсомольские организации.

Социалистическое соревнование в вузах — дело сравнительно новое и, прямо говоря, довольно сложное. Достаточно сказать, что до настоящего времени отсутствуют общесоюзные рекомендации по вопросам методики подведения его итогов между отдельными кафедрами, факультетами, другими подразделениями в масштабе вуза с учетом всех сторон работы: учебной, научно-методической, идейно-воспитательной, научно-исследовательской. Применяемая методика подведения итогов научно-исследовательской работы, позаимствованная у научных учреждений, не совсем приемлема для вуза, где главная задача — подготовка высококвалифицированных специалистов.

Учитывая все это, ректорат, партком, местный комитет профсоюза в последние годы много внимания уделили выработке критериев, позволяющих объективно сравнивать результаты деятельности различных подразделений. После широкого обсуждения на кафедрах, факультетах, в научных и других подразделениях партком утвердил условия социалистического соревнования в университете и методику подведения его результатов. С учетом опыта этот документ ежегодно корректируется. Он позволил нам сделать принимаемые подразделениями университета социалистические обязательства более конкретными, результаты его — сравнимыми, придать соревнованию состязательность, дух здорового соперничества.

Социалистические обязательства в честь юбилея Октября были всесторонне обсуждены и приняты каждой кафедрой и лабораторией, каждым факультетом и отделом. Многие преподаватели, научные сотрудники взяли индивидуальные социалистические обязательства. На собрании партийно-профсоюзного актива были приняты повышенные социалистические обязательства университета, включающие важнейшие задачи учебно-методической, научно-исследовательской и политико-воспитательной работы. Ими предусмотрено также проведение ряда общевузовских конкурсов: на лучшую студенческую академическую группу, на лучшее общежитие, на лучшую организацию художественной самодеятельности, лучшую постановку охраны труда и т. д. Заключен договор о социалистическом соревновании с Вильнюсским государственным университетом имени Капсукаса.

Принятие конкретных повышенных обязательств — важный, но лишь первый шаг в организации соревнования. Главное — это мобилизация коллектива на их выполнение, на успешное решение стоящих перед ним задач. Хорошо понимая это, ректорат, партийный комитет всю свою работу строят так, чтобы держать под повседневным контролем ход выполнения обязательств. Эти вопросы систематически обсуждаются на заседаниях ректората, советов университета и факультетов, на парткоме и партсобраниях факультетов и подразделений.

Большую полезную работу по контролю за выполнением принятых социалистических обязательств, подведению предварительных и окончательных результатов соревнования проводят местком, профсоюзные организации и профгруппы. Все эти организационные мероприятия позволили коллективу Белгосуниверситета уже к юбилею Великого Октября в основном выполнить обязательства, принятые на второй год десятой пятилетки, добиться дальнейшего совершенствования учебно-воспитательного процесса, развития и повышения эффективности научных исследований, улучшения качества подготовки высококвалифицированных специалистов.

Говоря о важнейших результатах нашей работы, прежде всего следует отметить, что БГУ в юбилейном году выполнил план подготовки молодых специалистов. В 1977 г. республика получила около 3 тысяч наших выпускников по 17 специальностям и 61 специализации. Среди них около 2 тысяч человек, завершивших обучение по дневной форме. Улучшились качественные показатели учебы: почти на два процента возросло число выпускников, получивших дипломы с отличием, 90 процентов защитили дипломные работы на «отлично» и «хорошо». Увеличилось количество студентов, занимающихся на «хорошо» и «отлично», уменьшилось число троечников.

(Окончание на 2—3-й стр.).

# Андрэй Рыгоравіч Мядзведзеў

*(да 80-годдзя з дня нараджэння).*



8 лістапада 1977 г. спаўняецца 80 год з дня нараджэння члена-карэспандэнта АН БССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР і прэміі імя акадэміка В. Р. Вільямса, загадчыка кафедры глебазнаўства і геалогіі геаграфічнага факультэта, доктара сельскагаспадарчых навук прафесара Андрэя Рыгоравіча Мядзведзева.

А. Р. Мядзведзеў нарадзіўся ў в. Сачылаў Старадубскай воласці Чарнігаўскай губерні ў сям'і селяніна. Адкрыццё Страдубскай ніжэйшай сельскагаспадарчай школы і вучоба ў ёй вызначылі далейшы жыццёвы і творчы шлях Андрэя Рыгоравіча ў галіне сельскай гаспадаркі па глебазнаўству і агранаміі. У 1915 годзе ён працягвае адукацыю ў Горацкім сярэднім зямельна-аграналічным вучылішчы; з 1919 па 1925 г. Андрэй Рыгоравіч — студэнт агранамічнага факультэта Гора-Горацкага сельскагаспадарчага інстытута (цяпер Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія). Сваю працоўную дзейнасць Андрэй Рыгоравіч пачаў яшчэ ў студэнцкія гады. Ён прайшоў шлях ад радавога тэхнічнага работніка да загадчыка кафедры глебазнаўства Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі (1931—1941).

З 1942 па 1945 г. А. Р. Мядзведзеву даручаюць правядзенне вопытных работ на Троіцкім полі Чалябінскай вобласці па вывучэнню агратэхнікі атрымання высокіх ураджаяў гароднінных культур і люцэрны. У 1945 г. А. Р. Мядзведзеў вяртаецца ў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, загадвае кафедрай глебазнаўства, выбіраецца дэканам факультэта аграхіміі і глебазнаўства (1944—1956), працягвае кіраваць глебавымі даследаваннямі ва ўсходняй частцы Беларусі; з 1958 па 1961 г. А. Р. Мядзведзеў — намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута глебазнаўства АСГН БССР.

У 1946 г. за сукупнасць работ у галіне глебазнаўства А. Р. Мядзведзеву была прысвоена вучоная ступень кандыдата сельскагаспадарчых навук. Абарона доктарскай дысертацыі адбылася ў 1951 годзе па тэме «Характарыстыка глебавага покрыва Беларускай ССР у сельскагаспадарчых мэтах».

У Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна працуе з 1959 г., з 1967 г. А. Р. Мядзведзеў — загадчык кафедры глебазнаўства і геалогіі геаграфічнага факультэта.

Пад кіраўніцтвам А. Р. Мядзведзева і пры асабістым яго ўдзеле праводзіліся як рэкагнасціровачныя, так і дэталёвыя буйнамаштабныя абследаванні глебаў калгасаў і саўгасаў рэспублікі. Па матэрыялах абследавання ім было складзена 740 глебавых буйнамаштабных карт і напісана 170 аграглебавых нарысаў. А. Р. Мядзведзевым былі закладзены тэарэтычныя і практычныя асновы развіцця ў Беларусі геаграфіі і картаграфіі глебаў. Праведзена вялікая работа па глебава-геаграфічнаму раяніраванню тэрыторыі рэспублікі і ўпершыню складзена карта глебава-аграхімічнага раяніравання БССР.

А. Р. Мядзведзеў — актыўны прапагандыст навуковых ведаў сярод насельніцтва рэспублікі, член рэдкалегій навуковых часопісаў «Вестник БГУ имени В. И. Ленина» і «Известия АН БССР». Ім апублікавана каля 130 работ, з іх 4 манаграфіі. За цыкл работ па глебавых даследаваннях і сааўтарства ў манаграфіі «Глебы: Беларускай ССР» А. Р. Мядзведзеву прысуджана званне лаурэата Дзяржаўнай прэміі БССР 1976 г. Усе свае веды і вопыт ён перадае студэнцкай моладзі.

За сваю доўгую педагагічную і навукова-даследчую дзейнасць А. Р. Мядзведзеў падрыхтаваў вялікі атрад высокакваліфікаваных спецыялістаў, у тым ліку 15 кандыдатаў навук.

Калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў геаграфічнага факультэта і ўсяго універсітэта сардэчна віншуе Андрэя Рыгоравіча Мядзведзева з юбілеем і жадае доўгіх год творчага і шчаслівага жыцця.

**Н. ЧАРТКО.**

## Святочная выстаўка

Празвінеў званок. Заняткі ва універсітэце скончыліся. І праз некалькі хвілін зала, дзе арганізавана выстаўка «Універсітэцкая навука — 60-годдзю Вялікага Кастрычніка», страціла сваю першаначатковую цішыню. Сюды прыйшлі студэнты, выкладчыкі, арганізатары выстаўкі і аўтары прадстаўленых экспанатаў.

Наведвальнікі ўступаюць у свет творчасці, у свет навукі, знаёмяцца тут з дасягненнямі вучоных, навукова-даследчай работай студэнтаў за апошнія гады.

Такая выстаўка арганізавана навуковым таварыствам БДУ ўпершыню. Яна наглядна падводзіць вынік навуковай дзейнасці факультэтаў.

Стаяць у зале мудрагелістыя па канструкцыі, складаныя электронныя апараты і фотапрылады. Сярод іх паліграф «Паток», прылада для аўтаматычнага вызначэння тэмпературы ўспышкі нафтапрадуктаў «Успышка» і іншыя.

Увага наведвальнікаў прыцягнута да цікавага апарата.

— Гэта ўнікальная міні-ЭВМ. Яна сканструявана вучонымі універсітэта і можа практычна вырашаць любую запраграміраваную задачу, — растлумачвае загадчык сектара навукова-тэхнічнай інфармацыі С. Паваляеў.

Недалёка ад сталоў з тэхнічнымі навінкамі — ўсемагчымая навуковая і вучэбная літаратура. Яна выпушчана выдавецтвам БДУ імя У. І. Леніна.

Вось што сказаў аб выстаўцы прафесар інстытута ядзерных даследаванняў АН УССР І. Д. Каназенка:

— Выдатна, што тут сканцэнтравана і літаратура, і фотадакументацыя, і арыгінальныя апараты. Тут прадстаўлены навуковыя матэрыялы ўсіх факультэтаў, таму любы наведвальнік зможа за дзве гадзіны азнаёміцца з багатай інфармацыяй.

На мой погляд, ёсць у зале выдатныя электронныя прылады, зробленыя студэнтамі і намнога перавышаючыя па якасці заводскія прылады. Безумоўна, такая выстаўка заслугоўвае высокай адзнакі.

На адкрыцці выстаўкі прысутнічалі намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР І. І. Леановіч, другі сакратар Маскоўскага райкома партыі П. Р. Нікіценка. Выстаўку наведалі намеснікі Старшыні Савета Міністраў БССР І. М. Глазкоў і Д. А. Данілаў, міністр мясцовай прамысловасці БССР Л. В. Русакоў.

**В. ЕРМАКОЎ.**

## Які ты быў, студэнт 30-х?

На пытанні нашага карэспандэнта адказвае член-карэспандэнт АН БССР, доктар хімічных навук, прафесар, загадчык кафедры аналітычнай хіміі хімічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна **Рыгор Лазаравіч СТАРОБІНЕЦ:**

**— Рыгор Лазаравіч, што дапамагло Вам знайсці сваё прызванне?**

— Сур'ёзна я зацікавіўся хіміяй у Барысаўскім педагагічным тэхнікуме, які скончыў у 1929 годзе. Наш выкладчык чытаў яе так цікава і захапляюча, што не «захварэць» гэтай навукай было, мне здаецца, немагчыма. Пасля трох гадоў настаўніцтва мая мара здзейснілася — я паступіў на хімічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. І ніколі не шкадаваў аб выбары сваёй прафесіі.

**— Якая, на ваш погляд, была галоўная рыса студэнта 30-х гадоў?**

— Цесная сувязь з жыццём усяго народа, пачуццё асабістай прыналежнасці да ўсіх падзей у краіне.

Вялікае месца ў нашым жыцці займала грамадская работа: студэнты кіравалі гурткамі па ліквідацыі непісьменнасці, чыталі лекцыі рабочым фабрык і заводаў, ездзілі з прапагандысцкімі выступленнямі па вёсках. Усе гэтыя справы рабіліся з маладым запалам, натхненнем, энтузіязмам.

**— Рыгор Лазаравіч, што яшчэ б Вы маглі адзначыць?**

— Нас, студэнтаў 30-х гадоў, яднала не толькі тое, што ўсе мы паступілі ва універсітэт з пэўным працоўным стажам. Адзіным было жаданне — вучыцца. Каб потым аддаць Радзіме свае веды.

Цяга да літаратуры, мастацтва была велізарная. Я, як сёння, памятаю цудоўныя, незабыўныя сустрэчы Я. Купалы, Я. Коласа, К. Чорнага і іншых нашых пісьменнікаў са студэнтамі. Вельмі папулярнымі сярод нас былі сустрэчы з артыстамі.

**— Што б Вы пажадалі сённяшнім студэнтам?**

— Юнацкага запалу, энтузіязму ва ўсіх справах. Імкнення да вялікага ў жыцці.

Гутарку правяла
**Т. ПАРАХНЕВІЧ.**

## Там, дзе пачынаецца Бацькаўшчына

...Ласток. На беразе сінявокага Нёмана, які задумліва коціць свае воды ўдалячынь, у маляўнічым, вабячым вока сваёй прыгажосцю месцы, непаўторна ўпісаўся ў пейзаж двухпавярховы будынак філіяла-музея Якуба Коласа. Недалёка прытулілася да магутных дрэў сялянская хата — родны дом сям'і Міцкевічаў. Побач узнімаюцца высокія разложыстыя ліпы, пасаджаныя рукамі паэта. Асаблівую прыгажосць і прывабнасць ім надае своеасаблівае адзенне восені. Золатам пераліваюцца ў промнях сонца жоўтыя лісты, у іх гучным шапаценні пад подыхам ветру, здаецца, чуваць голас самога песняра: «Прывет вам, племя маладое!»

Хочацца правесці рукою па цёплай, шурпатай кары дрэў. Як сімвал таго, што імя Якуба Коласа жыве ў сэрцы народа, яны ўзнімаюцца над наваколлем. Увесь выгляд дрэў гаворыць, што яны яшчэ моцныя і не адно пакаленне людзей, прыходзячы сюды, у задуменні будзе спыняцца перад іх веліччу.

...Але вось мы ў філіяле-музеі. Іосіф Міхайлавіч неяк непрыкметна звязвае свой расказ з паэмай «Новая зямля», у якой адлюстраваны быт і жыццё не толькі адной сям'і, але і ўсяго сялянства... Так проста, шчыра, даступна кожнаму гучаць радкі:

**«Мой родны кут, як ты мне мілы,**
**Забыць цябе не маю сілы!»**

І на самай справе. Хіба можна хоць на імгненне забыць зачароўваючы краявід азёраў гэтай зямлі. Здаецца, такіх кветак, такіх дрэў, такога неба няма больш нідзе.

Фатаграфіі рукапісаў вершаў Якуба Коласа, кнігі, карціны, стэнды гавораць аб яго энергічным, складаным, прыгожым і непаўторным жыцці. Бясцэнным скарбам беларускага народа сталі паэмы «Рыбакова хата», «Новая зямля», «Сымон-музыка», трылогія «На ростанях». Паэзія Якуба Коласа цесна звязана з жыццём, простая і шчырая, як песня, яна хутка знайшла дарогу да сэрца чытача. А хіба можна не захапляцца яго творамі нам, землякам, калі дзеючымі асобамі ў іх з'яўляюцца людзі гэтай мясцовасці, нашы дзяды і бабулі, нашы бацькі.

Здзіўляе ўважлівасць Якуба Коласа да наваколля, уменне самым звычайным і надзённым зацікавіць чытача.

**«Чуецца гоман мне спелае нівы,**
**Ціхая жальба палёў,**
**Леса высокага шум, гул шчаслівы,**
**Песня магутных дубоў».**

Простымі і натхнёнымі словамі Якуб Колас перадаў чалавечыя пачуцці.

**«Вось, як цяпер, перада мною**
**Устае куточак той прыгожы,**
**Крынічкі вузенькае ложа,**
**Дзе елкі ў пары з хваінаю,**
**Абняўшысь цесна над вадою,**
**Як маладыя ў час кахання,**
**У апошні вечар расставання».**

Добра, што на свеце ёсць людзі, якія могуць не толькі бачыць прыгажосць роднага краю, але пры дапамозе слова выклікаюць у чалавека самыя прыгожыя пачуцці.

...Якуб Колас. На гэтай зямлі ўсё цесна звязана з ім. Удзячныя землякі назвалі імем песняра калгас, школу, вуліцу, стварылі музей, паставілі помнік. «Шчасце для чалавека, калі яго імя стане нязгаснай зоркай у памяці народнай», — выказала свае пачуцці Лена Кукалевіч, вучаніца Мікалаеўшчынскай сярэдняй школы імя Якуба Коласа.

...Апошні пакой філіяла-музея. Ён апавядае пра апошнія гады жыцця пісьменніка. Хочацца крыкнуць голасам сэрца: «Азірніцеся навокал і вы ўбачыце сонца, дрэвы, кветкі, мора кветак. Як сведкі неўміручасці жыцця, яны ўзнімаюцца на нашай зямлі. Глыбока ў сэрца народа запала творчасць Коласа. Побач з намі жывуць героі яго твораў, здаецца, і сам ён знаходзіцца сярод нас, вось-вось запытае, як мы жывем, пачытае свой новы верш. Павітаем жа яго: «Дзень добры, Колас!»

...Колас жывы, бо жыве ў сэрцы народа яго творчасць. Яму цяпер 95. Дзевяноста пяць старонак, запоўненых цікавым зместам гісторыі. Здаецца, ён толькі на імгненне прысеў, задумаўся над новым творам. Ды так і застаўся сядзець навечна ў граніце, тут, на плошчы, якая носіць яго імя.

**«Высокі бераг, кут мой мілы!**
**Люблю я жоўць тваіх пяскоў,**
**Разложных хвоек гурт пахілы**
**І ціхі гоман лазнякоў».**

Я адчула, што моцна люблю гэтую зямлю, і ўсё наваколле стала часцінкай маёй душы. Раптам моцна захацелася нарваць букет кветак і палажыць іх ля падножжа бюста тут, у Мікалаеўшчыне, бо адгэтуль пачынаецца Бацькаўшчына, бо Колас дапамог знайсці мне сваё месца ў жыцці.

**Л. АТРУШКЕВІЧ,**
**студэнтка І курса журфака**
**(вячэрняе аддзяленне).**

У рабоце над нумарам прынялі ўдзел студэнты 2-й групы ІІ курса факультэта журналістыкі на чале з адказным Мікалаем Курганскім.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС

Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 03524. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Заказ № 1713